УДК 745.54(476.1):069.5

# ФОРМЫ АКТУАЛІЗАЦЫІ МАЛАДЗЕЧАНСКАЙ ШКОЛЫ ВЫЦІНАНКІ МІНСКІМ АБЛАСНЫМ КРАЯЗНАЎЧЫМ МУЗЕЕМ

***К. А. Скур'ят,***
*саіскальнік навуковай ступені кандыдата навук установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», навуковы супрацоўнік дзяржаўнай установы «Мінскі абласны краязнаўчы музей»*

**Анатацыя.** Канец XX – пачатак XXI ст. характарызуецца працэсам адраджэння традыцый беларускай выцінанкі. Адным з галоўных цэнтраў дадзенага віду дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва стаў горад Маладзечна, дзе сфарміравалася ўласная школа выцінанкі. Разглядаецца дзейнасць дзяржаўнай установы «Мінскі абласны краязнаўчы музей» па рэпрэзентацыі маладзечанскай школы выцінанкі як прыклад захавання і папулярызацыі сучасных традыцый беларускага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

**Ключавыя словы:** музей, выцінанка, сучаснае народнае мастацтва, этнаграфія, актуалізацыя, традыцыйная культура.

# THE FORMS OF ACTUALIZATION OF THE MOLODECHNO SCHOOL OF BELARUSIAN PAPERCUTTING BY THE MINSK REGIONAL MUSEUM OF LOCAL LORE

***K. Skuryat,***
*Competitor of a Scientific Degree of Candidate of Sciences of the Educational Institution «Belarusian State University of Culture and Arts», Researcher of the State Institution «Minsk Regional Local History Museum»*

**Abstract.** The end of the XX – beginning of the XXI century is characterized by a rapid revival of the traditions of Belarusian papercutting. Molodechno has become one of the main centers of this

type of decorative and applied art, where its own school of papercutting was formed. The article examines the activities of the Minsk Regional Museum of Local Lore based on the ideas of the Molodechno Paper-cutting school as an example of preserving and popularizing modern traditions of Belarusian decorative and applied art.

**Keywords:** museum, papercutting, modern folk art, ethnography, actualization, traditional culture.

Мастацтва выразання з паперы сыходзіць каранямі да эпохі Старажытнага Кітая [9, р. 41]. Пастунова выразанне з паперы распаўсюдзілася па тэрыторыі і Еўразійскага кантынента.

Першымі выразкамі з паперы на тэрыторыі Беларусі прынята лічыць кустодзіі, якія ствараліся з сярэдзіны XVI да пачатку XX ст. з мэтай абароны васковых і сургучных пячатак [3, с. 6]. Паводле даследчыцы В. А. Лабачэўскай, мясцовая шляхта пазнаёмілася з мастацкім выразаннем з паперы ў другой палове XVIII ст. пасля ўваходжання тэрыторыі Беларусі ў склад Расійскай імперыі [Там жа, с. 7].

У сярэдзіне XIX ст. мастацтва выразання з паперы пранікла ў сялянскае асяроддзе, дзе атрымала назву «выцінанка» (таксама «выразка», «выразанка», «выстрыганка») [2, с. 9]. Выразкі ствараліся з тонкай паперы ў выглядзе сурвэтак, рушнікоў, дываноў з раслiннымі, зоаморфнымі, геаметрычнымі ўзорамі, характэрнымі для традыцыйнай беларускай культуры. Выразкамі з паперы аздаблялі вокны (фіранкі), сцены, мэблю, чырвоны кут [5].

Масавы характар у беларускай вёсцы выцінанка атрымала ў канцы XIX – першай палове XX ст., а ў другой палове XX ст. на тэрыторыі Беларусі страціла ўтылітарную ролю і стала папулярным відам дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

Канец 1980-х – пачатак 1990-х гг. характарызуецца ростам зацікаўленасці грамадства да традыцыйнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, на базах цэнтраў народнай творчасці, дамоў культуры, школ пачынаюць адкрывацца кружкі выцінанкі пад кіраўніцтвам народных майстроў. Адным з цэнтраў беларускай выцінанкі, пачынаючы з 1990-х гг., стаў г. Маладзечна, дзе пад кіраўніцтвам народнага майстра Вікторыі Мікітаўны Чырвонцавай сфарміравалася ўласная мастацкая школа [4].

Ва ўстанове адукацыі «Маладзечанскі дзяржаўны музычны каледж імя М. К. Агінскага» створана аддзяленне дэкаратыўна-

прыкладнога мастацтва (1995), у навучальную праграму якога ўведзены адзіны ў Еўропе курс па выкладанні выцінанкі. Методыка выкладання і вучэбная праграма распрацаваны В. М. Чырвонцавай.

З 1993 г. наладжана супрацоўніцтва паміж майстрамі маладзечанскай школы выцінанкі і навуковымі супрацоўнікамі дзяржаўнай установы «Мінскі абласны краязнаўчы музей». У лістападзе 1993 г. у фонд музея паступілі 16 выцінанак, якія сталі асновай будучай калекцыі.

Сярод першых паступленняў вялікай зацікаўленасцю аматараў карыстаюцца працы аўтараў Лізаветы Львоўны Чырвонцавай (серыя работ «Народныя святы беларусаў», «Жытняя баба» і інш.) і Вольгі Яўгенаўны Аўласевіч («Мінскі Кальварыйскі касцёл», «Клецк. Касцёл дамініканцаў», серыя работ, прысвечаная народным строям і інш.).

Творы адрозніваюць выразнасць кампазіцыі, спалучэнне элементаў традыцыйнай беларускай выцінанкі (арнамент, сімволіка) і сілуэтнага выразання, стылізацыя вобразаў і ажурны арнамент. Асноўнай тэмай работ з'яўляецца нацыянальная спадчына беларускага народа – міфалогія, народныя святы, народныя строі і інш.

Калекцыя маладзечанскай выцінанкі працягвае папаўняцца і ў пачатку XXI ст. Так, сярод апошніх паступленняў трэба адзначыць выцінанку «У добры шлях» народнага майстра Людмілы Мікалаеўны Валковіч-Борыс.

Найбольш распаўсюджанай формай актуалізацыі мастацтва маладзечанскай школы выцінанкі з'яўляюцца часовыя экспазіцыі, якія, як правіла, арганізуюцца супрацоўнікамі краязнаўчага музея сумесна з народнымі майстрамі.

Напрыклад, у рамках VI Міжнароднага сімпозіума «Художественное вырезание: форма и цвет» (2016) на базе дзяржаўнай установы «Мінскі абласны краязнаўчы музей» арганізавана выстава «Пялёсткі памяці», прысвечаная памяці В. М. Чырвонцавай – заснавальніцы маладзечанскай школы выцінанкі. Наведвальнікі ўбачылі больш за 30 работ вучняў Вікторыі Мікітаўны, у тым ліку з фондаў музея.

Акрамя стацыянарных выстаў, мастацтва маладзечанскай школы выцінанкі рэпрэзентуецца і на рэспубліканскім узроўні. Так, 13–14 мая 2024 г. дзяржаўная ўстанова «Мінскі абласны краязнаўчы музей» прыняла ўдзел у выставе, прысвечанай Дню Дзяржаўнага герба, Дзяржаўнага сцяга і Дзяржаўнага гімна

Рэспублікі Беларусь, а з 28 чэрвеня па 3 ліпеня 2024 г. – у Палацы Рэспублікі на часовай экспазіцыі Мінскай вобласці «Хлеб, мир, созидание» прадстаўлены выцінанкі з фондаў музея.

Спецыяльна да выставы на абласным свяце «Дажынкі-2024» супрацоўнікамі краязнаўчага музею выканана вялікая копія выцінанкі «Жытняя баба» Л. Л. Чырвонцавай. Жытняя баба – вобраз беларускай міфалогіі, увасабленне багацця і дабрабыту [8]. Навуковым супрацоўнікам музея Ганнай Барысаўнай Кавалевіч створана копія строя з выцінанкі, у якім мог сфатаграфавацца кожны жадаючы.

На пачатку XXI ст. у практыцы айчынных рэгіянальных краязнаўчых музеяў пачалі ўкараняцца такія формы культурна-адукацыйнай дзейнасці, як музейна-педагагічныя праграмы, музейныя святы, майстар-класы і інш. [1]. Найбольш папулярнай формай актуалізацыі сучаснага народнага мастацтва з'яўляюцца майстар-класы ў рамках часовых музейных выстаў.

Так, падчас выставы «Дрэва жыцця» пад кіраўніцтвам народнага майстра Л. Л. Чырвонцавай прайшоў майстар-клас па стварэнні аднайменнай кампазіцыі. Вобраз дрэва ў традыцыйнай беларускай культуры ўвасабляе ўніверсальную канцэпцыю будовы Свету [6]. Супрацоўнікі музея падрыхтавалі неабходныя матэрыялы, а ўдзельнікі выразалі ўзоры і наклеілі іх на паперу. Такая форма работы падыходзіць як для дзяцей, так і дарослых наведвальнікаў.

Такім чынам, супрацоўніцтва паміж майстрамі маладзечанскай школы выцінанкі і дзяржаўнай установай «Мінскі абласны краязнаўчы музей» з'яўляецца яскравым прыкладам папулярызацыі сучасных народных рамёстваў з дапамогай музейных сродкаў. У краязнаўчым музеі фарміруецца і захоўваецца калекцыя твораў майстроў, якія рэпрэзентуюцца як на мясцовым (часовыя выставы, майстар-класы), так і рэспубліканскім узроўнях (перасоўныя выставы). Такая дзейнасць спрыяе захаванню і развіццю маладзечанскай школы выцінанкі.

4 снежня 2024 г. міжурадавы Камітэт па ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны ЮНЕСКА прыняў рашэнне аб уключэнні беларускага мастацтва выцінанкі ў Рэпрэзентатыўны спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны чалавецтва [7].

*1. Бамбешка, І. І.* Інавацыйныя формы культурна-адукацыйнай дзейнасці ў практыцы рэгіянальных краязнаўчых музеяў Рэспублікі / І. І. Бамбешка // Веснік Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. – 2019. – № 2. – С. 137–148.

*2. Коваленко, В. И.* Искусство вытинанки / В. И. Коваленко. – Изд. 2-е. – Мінск : Беларусь, 2011. – 115 с.

*3. Лобачевская, О. А.* О путях распространения бумажной вырезки в Беларуси / О. А. Лобачевская, Тянь Лу // Искусство и культура. – 2023. – № 3. – С. 5–8.

*4.* Маладзечанская школа выцінанкі. – URL: https://vytinanka.by/maladzechanskaja-shkolavycinanki/ (дата звароту: 04.12.2024).

*5.* Мастацтва выцінанкі Мінскай вобласці. – URL: https://heritage.gov.by/catalog/mastatctva-vytcinanki-minskai-voblastci (дата звароту: 06.03.2025).

*6. Нароўская, А. М.* Вобраз сусветнага дрэва ў прадметным асяроддзі беларусаў / А. М. Нароўская // Этнакультурнае даследаванне флоры Беларусі XIX–XX стст. : X Тышкевіцкія чытанні, Мядзел, 20 верасня 2024 г. : зб. навук. арт. / М-ва культуры Рэсп. Беларусь ; Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў ; рэдкал.: А. І. Смолік (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2024. – С. 85–90.

*7.* О включении белорусского элемента нематериального культурного наследия «Вытинанка» в список ЮНЕСКО. – URL: https://mfa.gov.by/press/news_mfa/eb411c31678d13a9.html (дата доступа: 04.12.2024).

*8. Піліпенка, М. Ф.* Жытняя баба / М. Ф. Піліпенка // Этнаграфія Беларусі : энцыклапедыя / Беларуская савецкая энцыклапедыя ; рэдкал.: І. П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.] ; навук. кансультанты: М. В. Біч, А. П. Грыцкевіч, У. С. Гуркоў [і інш.]. – Мінск : БелСЭ, 1989. – С. 199.

*9. Wu, Fatima.* A Glimpse of Chinese Culture Through Papercuts / Fatima Wu // Education About Asia. – 2004. – Vol. 9, № 1. – P. 40–46.